ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 34 (1032) ● ПЯТНІЦА, 30 лістапада 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.



Пазаўчора адбыўся справаздачна-выбарны сход камуністаў універсітэта. З дакладам выступіла сакратар парткома БДУ Т. Я. Дударава.

У адрас форума камуністаў прыйшла віншавальная тэлеграма ад дэлегатаў X партыйнай канферэнцыі Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічнага інстытута.

НА ЗДЫМКУ: у прэзідыуме партыйнага сходу сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, сакратар Кастрычніцкага РК КПБ Н. В. Фокіна, рэктар БДУ У. М. Сікорскі, прадстаўнікі партыйных арганізацый універсітэта.

## ГАЛОЎНЫ НАСТАЎНІК

*ІДЗЕ ЛЕНІНСКІ ЎРОК*

На заключны Ленінскі ўрок «Вучыцца, працаваць і змагацца па Леніну» студэнты геаграфічнага факультэта запрасілі дарагіх гасцей — ветэрана партыі, дэлегата І з'езда жанчын-работніц А. І. Мораву, якая бачыла У. І. Леніна і чула яго выступленні, і заслужанага дзеяча мастацтва РСФСР, аднаго з першых выканаўцаў ролі Леніна ў тэатры Аляксандра Аляксандравіча Дабroцiна.

З вялікай цікавасцю слухалі студэнты расказ Аляксандры Іванаўны Моравай, як у 1918 годзе яна была выбрана дэлегатам на з'езд жанчын-работніц ад тэкстыльнай фабрыкі горада Растова.

З'езд праходзіў у Калоннай зале. На ім было 1200 дэлегатак. Адкрыў з'езд старшыня ВЦВК тав. Свярдлоў.

У адзін з дней работы на з'езд прыбыў У. І. Ленін. Ён быў хворы, але выступіў перад работніцамі і сялянкамі. Гаварыў Уладзімір Ільіч нядоўга, усяго 30 мінут. Ён заклікаў дэлегатак актыўна ўключыцца ў будаўніцтва новай дзяржавы, як мага хутчэй ліквідаваць непісьменнасць і малапісьменнасць, займацца самаадукацыяй, вучыцца так, каб кожная кухарка магла кіраваць дзяржавай. Прамова Уладзіміра Ільіча была простай і даступнай. Жанчыны слухалі прамову з вялікай увагай і хваляваннем.

— Мы змагаліся за ўмацаванне Савецкай дзяржавы і перамаглі. Гэты шлях асвятляюся указаннямі У. І. Леніна, — закончыла А. І. Морава свой расказ.

Ветэран партыі пажадала камсамольцам прыйсці да 50-годдзя з дня прысваення ВЛКСМ імя У. І. Леніна з выдатнымі поспехамі ў вучобе і працы.

Аляксандр Аляксандравіч Даброцін — артыст, рэжысёр, настаўнік. Ён быў асабіста знаёмы з С. М. Кіравым, А. М. Горкім, А. В. Луначарскім, А. П. Карпінскім, Н. К. Крупскай. Ён гаворыць — і перад слухачамі ажываюць старонкі гісторыі.

17 лістапада 1937 года ў Маскве адкрыўся занавес тэатра, і на сцэну выйшаў Б. В. Шчукін у ролі Леніна ў спектаклі «Чалавек з ружжом». Усе ўсталі, запладзіравалі, некаторыя нават заплакалі. Людзі ўпершыню ўбачылі на сцэне «жывога» Ільіча.

Барыс Васільевіч Шчукін быў неперасягненым выканаўцам ролі Леніна. Пазней савецкі ўрад даручыў ролю Леніна сямі акцёрам. У іх ліку быў і А. А. Даброцін.

Аляксандр Аляксандравіч успамінае, як выступаў у ролі Леніна перад байцамі на Волжскім і Карэльскім франтах, аб тым, як ад вялікага шчасця — бачыць на фронце «жывога» Леніна — нярэдка ні гледачы, ні самі акцёры доўга не маглі вымавіць ні слова...

Заслужаны артыст свзё выступленне прамовай Леніна са спектакля М. Пагодзіна «Чалавек з ружжом».

Са словамі падзякі старэйшым таварышам выступіла студэнтка Аня Трацэўская:

— Нашаму пакаленню не давялося быць удзельнікамі вялікіх падзей Кастрычніка, але мы заўсёды помнім аб людзях, якія так многа зрабілі для нас.

Вялікае дзякуй за тое, што над намі мірнае неба, яснае сонца, дзякуй, што ў нас шчаслівае юнацтва!

Студэнты падарылі дарагім гасцям букеты кветак.

Такі Ленінскі ўрок запомніцца надоўга.

**Н. НОВІКАВА.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

## XXV РАЁННАЯ

Адбылася чарговая, XXV справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя Акцябрскага раёна г. Мінска.

З дакладам аб рабоце РК ЛКСМБ па выкананню рашэнняў XXIV з'езда КПСС, XVI з'езда ВЛКСМ і XXIV з'езда ЛКСМБ выступіў першы сакратар У. А. Наумчык.

Па выніках работы за першае паўгоддзе 1973 года раённая камсамольская арганізацыя ўзнагароджана пераходнымі Чырвонымі сцягамі ЦК ВЛКСМ і Мінскага ГК ЛКСМ Беларусі.

У раёне больш 12 тысяч юнакоў і дзяўчат змагаюцца за прысваенне звання «Ударнік камуністычнай працы», звыш 4,5 тысячы маладых перадавікоў вытворчасці заваявалі гэта званне. Камсамольцы і моладзь раёна імкнуцца ўнесці свой уклад у датэрміновае выкананне народнагаспадарчага плана трэцяга, рашаючага года дзевятай пяцігодкі пад лозунгам «Даць прадукцыі больш, лепшай якасці і з меншымі затратамі».

У дакладзе таксама была адзначана вялікая ідэйна-выхаваўчая і вучэбная работа нашага універсітэта.

Канферэнцыя зацвердзіла новы састаў райкома камсамола з 85 чалавек. Першым сакратаром выбран У. Сцяпук, другім — Л. Ярашэвіч, трэцім — А. Малюкова.

## СЛУЖБА ІНФАРМАЦЫІ

Інфармацыйная дзейнасць стала адным з важнейшых сродкаў удасканалення педагагічнай і навуковай дзейнасці вну. У цяперашні час арганізуюцца службы інфармацыі ва ўсіх вну краіны. Такая служба створана і ў нашым універсітэце.

Аддзел навукова-тэхнічнай інфармацыі БДУ складаецца з чатырох сектараў:

1. Збору, навуковага аналізу, абагульнення і аператыўнай інфармацыі.
2. Навукова-тэхнічнай прапаганды.
3. Патэнтна-ліцэнзійны.
4. Капіравальна-множыльны.

Асноўныя функцыянальныя абавязкі першага сектара — вывучэнне інфармацыйных патрэб і забеспячэнне прафесарска-выкладчыцкага саставу, навуковых работнікаў, інжынераў і аспірантаў універсітэта найбольш поўнай інфармацыяй аб навейшых дасягненнях айчыннай і замежнай навукі і тэхнікі, перадавым вопыце арганізацыі вучэбнага працэсу па профілю універсітэта.

Сектар арганізуе разам са спецыялістамі кафедр і лабараторый дзяржаўную рэгістрацыю ва УНТІцэнтры навукова-даследчых работ і вопытна - канструктарскіх распрацовак. Інфармуе цэнтральныя галіновыя органы інфармацыі і БелНДІНТІ аб выніках навуковых даследаванняў, праведзеных універсітэтам.

Сектар навукова-тэхнічнай прапаганды разам з іншымі падраздзяленнямі і грамадскімі арганізацыямі універсітэта прапагандуе навуковую арганізацыю працы і перадавы вопыт па камуністычнаму выхаванню студэнцкай моладзі ў вышэйшай школе, а таксама дасягненні навукі і тэхнікі шляхам удзелу ў арганізацыі нарад, семінараў, лекцый, выставак, падрыхтоўцы спецыяльных перадач па радыё, тэлебачанню, артыкулаў да друку і г. д.

Сектар патэнтна-ліцэнзійны праводзіць мерапрыемствы па ахове дзяржаўных інтарэсаў СССР у галіне вынаходніцтваў і навуковых адкрыццяў, садзейнічае развіццю вынаходніцкай і патэнтна-ліцэнзійнай работы.

Сектар капіравальна-множыльны выконвае работы па капіраванню і размнажэнню для мэт навукова-тэхнічнай інфармацыі.

**Я. МЕЛЬНІКАЎ,**
**загадчык аддзела навукова-тэхнічнай інфармацыі.**





У другакурснікаў біяфака—практычныя заняткі па анатоміі чалавека. Вядзе іх кандыдат біялагічных навук Ірына Іванаўна Саладоўнікава. Адказвае Таня Аўчыннікава.



## ФУНКЦЫІ КАНТРАЛЁРАЎ— САМЫМ ДАСТОЙНЫМ

Народны КАНТРОЛЬ

У нашай краіне дзейнічае больш аднаго мільёна ста тысяч груп і пастоў народнага кантролю. Яны — надзейныя памочнікі партыйных арганізацый і адміністрацыі ў барацьбе з безгаспадарчасцю і неашчаднасцю, парушэннем дзяржаўнай і вытворчай дысцыпліны, сацыялістычнай законнасці.

Вялікая і шматгранная работа народных кантралёраў атрымала высокую ацэнку на XXIV з'ездзе партыі. «У сістэме савецкай сацыялістычнай дэмакратыі, — адзначалася ў Справаздачным дакладзе ЦК КПСС, — важнае месца займаюць органы народнага кантролю, у рабоце якіх цяпер прымаюць удзел мільёны рабочых, калгаснікаў, служачых. Партыя і далей будзе клапаціцца аб тым, каб ленінскія ідэі аб пастаянным і дзейсным кантролі з боку шырокіх мас непахісна ажыццяўляліся».

У сувязі з заканчэннем паўнамоцтва груп і пастоў народнага кантролю Камітэт народнага кантролю СССР прыняў пастанову аб правядзенні справаздач і выбараў.

Ва універсітэце згодна з рашэннем парткома справаздачы і выбары груп і пастоў народнага кантролю на факультэтах, у АГЧ, на ваеннай кафедры, у выдавецтве універсітэта павінны быць закончаны да 15 снежня г. г. Справаздача і выбары універсітэцкай групы народнага кантролю намечаны на 26 снежня г. г.

Такім чынам, першы этап справаздачна - выбарнай кампаніі — гэта канферэнцыі прадстаўнікоў факультэтаў, сходы калектываў АГЧ, ваеннай кафедры, выдавецтва. Будуць заслуханы і абмеркаваны справаздачы груп, ацэнена іх работа, дадзены наказы ўноў выбраным народным кантралёрам. Вельмі важна так падрыхтаваць гэтыя канферэнцыі, каб яны прайшлі на высокім арганізацыйным і палітычным узроўні, у дзелавых абставінах. Удзельнікі канферэнцый і сходаў павінны прад'явіць высокія патрабаванні да тых, каму яны даверылі здзяйсняць кантроль, належна ацаніць поспехі.

У групы і пасты народнага кантролю неабходна выбраць найбольш аўтарытэтных і актыўных выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў як камуністаў, так і беспартыйных. З мэтай пераемнасці ў рабоце пажадана выбраць на новы тэрмін тых таварышаў, якія актыўна працавалі ў складзе груп народнага кантролю, накапілі карысны вопыт.

Старшынямі груп належыць рэкамендаваць ініцыятыўных і прынцыповых таварышаў, палітычна сталых, баявых і ўмелых арганізатараў народнага кантролю.

На факультэцкіх канферэнцыях і сходах у АГЧ, на ваеннай кафедры і ў выдавецтве будуць выбраны дэлегаты на агульнауніверсітэцкую канферэнцыю па народнаму кантролю, якая падвядзе вынікі работы універсітэцкай групы і ўсіх двухсотпяцідзесяці народных кантралёраў БДУ.

Падрыхтоўка да справаздач і выбараў павінна праходзіць у абстаноўцы актыўнай работы народных кантралёраў, павышэння эфектыўнасці іх дзейнасці.

**Я. ТАГУНОЎ,**
**старшыня універсітэцкай групы народнага кантролю.**

# ПРАЦАВАЦЬ ТВОРЧА,

## З ВЫСТУПЛЕННЯЎ КАМУНІСТАЎ

**Я. А. Мацвіенка,**
**сакратар партбюро**
**юрыдычнага факультэта**

На нашым факультэце ў цяперашні час працуе 10 дактароў навук і 36 кандыдатаў. Гэта вялікая навуковая сіла. Але ці выкарыстоўваецца яна ў поўную меру? Думаецца, што не.

Так, работнікі факультэта актыўна вядуць навукова-даследчую работу, публікуюць многа работ: манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, брашур, артыкулаў. Некаторыя з іх атрымалі станоўчы водгук як у СССР, так і за мяжой, былі прадстаўлены на ВДНГ.

Аднак аналіз паказвае, што гэтыя работы прысвечаны хоць і важным, але прыватным праблемам. Няма работ фундаментальных, якія патрабуюць аб'яднання творчых намаганняў навуковых работнікаў сумежных спецыяльнасцей розных кафедр. Цяперашняя ўнутраная структура не дазваляе гэта зрабіць. Акрамя таго, для глыбокіх даследаванняў цяпер недастаткова чыста дагматычнага, абстрактнага падыходу. Патрабуецца сістэматычнае выкарыстанне даных сацыялагічных і псіхалагічных даследаванняў, аб'ёмнай апрацоўкі матэрыялаў. Гэта не можа зрабіць ні адзін выкладчык, ні адна кафедра паасобку.

Выхад вядомы: стварэнне ў вну навуковых падраздзяленняў.

Юрыдычны факультэт ужо многа год ставіць пытанне аб стварэнні на факультэце навукова-даследчай лабараторыі па актуальных праблемах Савецкай дзяржавы і права. Мы хацелі б, каб яго вырашэнне паскорылася.

**М. Нікішын,**
**сакратар камсамольскай**
**арганізацыі факультэта**
**журналістыкі**

У справаздачным дакладзе партыйнага камітэта ужо гаварылася аб ролі і месцы камуністаў у камсамоле, аб іх задачах і праблемах. Але мне здаецца, што на пытанні здзяйснення партыйнага кіраўніцтва камсамолам трэба было б спыніцца падрабязней.

У нас на факультэце з першых дзён вучобы курс раздзяляецца на вучэбныя групы так, каб, па магчымасці, у кожнай групе быў камуніст. Іменна праз іх і ажыццяўляецца кіраўніцтва курсам. Потым некаторыя з камуністаў назначаюцца старастамі вучэбных груп або курсаў.

Партыйная арганізацыя факультэта пастаянна знаходзіцца ў курсе спраў і падзей кожнай вучэбнай групы. Нярэдка на пасяджэнні партыйнага бюро выносяцца справаздачы партгрупоргаў курса, заслухоўваюцца камсамольскія бюро груп, камітэт камсамола, прафсаюзнае бюро факультэта. Таму і ўся работа грамадскіх арганізацый вядзецца ў адпаведнасці з планамі выхаваўчай работы партыйнага бюро факультэта і дэканата. Як правіла, на адкрытыя партыйныя сходы запрашаюцца камсамольскія актывісты, якія ўдзельнічаюць у абмеркаванні ўсіх пытанняў.

Атрымаў падтрымку ў нас вопыт партыйнай групы IV курса (парторг М. Маркевіч), дзе на сходы групы запрашаюцца ўсе актывісты курса. Але партгрупа не падмяняе камсамольскае бюро. На сходах партгрупы абмяркоўваюцца самыя важныя пытанні з жыцця курса: паспяховасць, наведванне заняткаў, правядзенне палітыка-выхаваўчых і культурна-масавых мерапрыемстваў. Іменна на гэтых сходах камсамольскія актывісты правяраюць правільнасць напрамку работы камсамольскіх бюро. Вопыт работы партыйнай групы быў абагульнен і рэкамендаван іншым групам. І ён прыжыўся на факультэце.

Камсамольская арганізацыя факультэта журналістыкі аб'явіла сёлетні навучальны год ударным, годам высокай дысцыплінаванасці і паспяховасці. Кожнае сваё дасягненне, кожны новы поспех мы прысвячаем 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.



Сход камуністаў універсітэта праходзіць у дні, калі намаганні савецкага народа накіраваны на паспяховае завяршэнне трэцяга, рашаючага года пяцігодкі. Немалы ўклад у гэтую агульнанародную справу ўносяць калектыў і партыйная арганізацыя БДУ, якая налічвае ў сваіх радах 1161 члена КПСС і 43 кандыдаты ў члены КПСС, аб'яднаных у 21 пярвічную арганізацыю, 75 груп.

З моманту апошняга справаздачна - выбарнага сходу наша партарганізацыя павялічылася на 260 чалавек. Найбольш буйнымі па-ранейшаму з'яўляюцца партарганізацыі юрыдычнага, філалагічнага, фізічнага, гістарычнага факультэтаў. Палепшыўся яе якасны састаў. Цяпер у яе саставе тры акадэмікі, шэсць членаў - карэспандэнтаў Акадэміі навук БССР і Акадэміі педагагічных навук СССР, 45 прафесараў, 282 кандыдаты навук і дацэнты, 33 старшыя і малодшыя навуковыя супрацоўнікі, 49 інжынераў і тэхнікаў, 50 аспірантаў і 289 студэнтаў. Наша арганізацыя — баявы, маналітны калектыў, здольны выконваць любыя заданні партыі.

У ходзе падрыхтоўкі да абмену партыйных дакументаў яна ідэйна і арганізацыйна ўзмацнела, падняўся узровень яе арганізатарскай і ідэйна-выхаваўчай работы.

У сваёй рабоце партком улічваў крытычныя заўвагі, парады камуністаў, якія былі выказаны на сходах. Партком абагульніў іх і распрацаваў план мерапрыемстваў, які ажыццяўляецца.

Па ўсіх напрамках дзейнасці партком стараўся абапірацца на шырокае кола партыйнага актыву, прафсаюзны і камсамольскі актыў. Усяго за справаздачны перыяд праведзена 75 пасяджэнняў, найбольш сур'ёзныя пытанні выносіліся на абмеркаванне агульных сходаў і партыйных актываў, якіх за справаздачны перыяд было восем.

### ВУЧЭБНАЯ І НАВУКОВАЯ РАБОТА

Улічваючы, што рашэнне задач камуністычнага будаўніцтва, здзяйсненне навукова - тэхнічнай рэвалюцыі патрабуе спецыялістаў высокай кваліфікацыі, галоўная ўвага была сканцэнтравана на павышэнні якасці навучання студэнтаў. Пытанні вучэбнай работы неаднаразова абмяркоўваліся на парткоме, у партарганізацыях.

Вялікая работа была праведзена па ўдасканаленню планавання вучэбнага працэсу, укараненню ў яго вылічальнай тэхнікі і матэматыкі. Навучанне студэнтаў па некаторых спецыяльнасцях стала праводзіцца на больш сучасным абсталяванні, шырэй сталі выкарыстоўвацца магчымасці правядзення вытворчых практык на перадавых прамысловых прадпрыемствах і г. д.

Вядома, што якасць падрыхтоўкі ў многім залежыць ад узроўню выкладання, кваліфікацыі выкладчыкаў, іх навуковага і палітычнага росту, і таму вялікая ўвага ўдзялялася рабоце з кадрамі.

Значная частка выкладчыкаў павышае кваліфікацыю праз дактарантуру і аспірантуру, паспяхова абараняе доктарскія і кандыдацкія дысертацыі. За справаздачны перыяд абаранілі доктарскія дысертацыі 22 чалавекі. Сярод іх: тт. Булацкі, Пікулеў, Івашын, Лойка, Цікоцкі, Галаўко, Жмуроўскі, Малашка, Мардыкін, Саржэўскі, Герман, Наркевіч і іншыя. Кандыдацкія дысертацыі абаранілі 122 чалавекі.

## З'ЯДНАЎШЫ

Прыкладна 20 працэнтаў выкладчыкаў штогод павышаюць сваю кваліфікацыю ў ІПК, на розных курсах. Ва універсітэце працуе школа маладога выкладчыка.

Вялікая ўвага ўдзяляецца ідэйнай загартоўцы выкладчыкаў, авалоданню імі марксісцка - ленінскай тэорыяй. Працуюць 34 тэарэтычныя і метадалагічныя семінары, у якіх навучаецца каля тысячы чалавек.

Меры, прынятыя па ўдасканаленню вучэбнага працэсу, павышэнню кваліфікацыі выкладчыцкага саставу далі свае станоўчыя вынікі. Агульная паспяховасць па універсітэту за мінулы навучальны год склала 90,7 працэнта. Амаль 11 працэнтаў студэнтаў здалі экзамены на выдатна, 44 працэнты — на добра.

Аднак калі падысці да гэтых вынікаў крытычна, то мы ўбачым, што за сярэднімі лічбамі хаваецца вельмі многа недаробак. Мы не можам сказаць, што зроблена ўсё неабходнае для забеспячэння высокага ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў. Нас не можа задаволіць стан паспяховасці. Тут мы адстаем ад многіх вядучых вну краіны.

Аналіз паспяховасці гаворыць аб тым, што большасць нездавальняючых адзнак прыпадае на першыя два курсы. І таму неабходна больш удзяляць увагі студэнтам першых курсаў, больш улічваць спецыфіку работы на гэтых курсах.

Вялікая ўвага ў справаздачным перыядзе ўдзялялася навукова - даследчай рабоце. За апошні час былі абмеркаваны: дзейнасць партарганізацыі матэматычнага факультэта па забеспячэнню навуковых даследаванняў; работа лабараторыі сацыялагічных даследаванняў; аб стане і мерах паляпшэння работы СНТ універсітэта; аб навуковых сувязях універсітэта з замежнымі краінамі; работа аддзела аспірантуры; аб больш хуткім укараненні закончаных навукова-даследчых работ.

На мінулым справаздачным сходзе адзначаліся сур'ёзныя недахопы ў арганізацыі навукова-даследчай работы. У прыватнасці, размова ішла аб дробнатэм'і, раз'яднанасці, малой колькасці комплексных тэм, якія б аб'ядноўвалі работу многіх кафедр і лабараторый і г. д. Каб ліквідаваць гэтыя недахопы, кафедры, навукова-даследчыя лабараторыі і інстытут прыкладных фізічных праблем распрацавалі гадавыя і перспектыўныя, да 1975 года, тэматычныя планы навуковых даследаванняў. Прыняты меры па канцэнтрацыі сіл і сродкаў на распрацоўцы больш перспектыўнай тэматыкі, якая мае важнае народнагаспадарчае значэнне. Асноўныя навуковыя даследаванні былі сарыентаваны на рашэнне праблем, указаных у рэкамендацыях АН СССР. У выніку скарацілася колькасць дробных кафедральных тэм, вядзецца распрацоўка вялікіх тэм па тэматычнаму плану універсітэта, каардынацыйных планах АН СССР і БССР, тэматыцы Дзяржкамітэта па навуцы і тэхніцы.

Важныя вынікі былі атрыманы фізікамі ў галіне радыёэлектронікі, спектраскапіі, фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, распрацоўкі новых кантрольна-вымяральных прыбораў і абсталявання; вучонымі матэматычнага факультэта — у га-

**П. Л. Салаў,**
**сакратар партбюро**
**фізічнага факультэта**

За справаздачны перыяд на фізічным факультэце адбыліся вялікія змены. На яго базе створан і паспяхова працуе інстытут прыкладных фізічных праблем. Калі раней стаяла пытанне, як і што выдзеліць інстытуту, каб ён быў жыццяздольным, то зараз размова ідзе аб тым, як наладзіць арганічную сувязь інстытута з факультэтам. Ужо цяпер можна сказаць, што многія студэнты прыцягнуты інстытутам да навуковай работы, асабліва студэнты кафедры фізікі паўправаднікоў. Некаторыя праходзяць там вытворчую практыку.

Толькі ў гэтым годзе факультэтам будзе выканана гаспадарча-дагаворная работа на суму 1 млн. 279 тысяч рублёў. Такі аб'ём прадстаўляе той разумны ўзровень, калі гаспадарча-дагаворная работа дапаўняе вучэбны працэс. Сваімі сіламі мы можам забяспечыць вучэбны працэс і навуковыя даследаванні неабходнымі матэрыяламі і абсталяваннем. Гаспадарча-дагаворная работа вядзецца сіламі выкладчыцкага саставу факультэта і той часткай супрацоўнікаў з ліку нашых выпускнікоў, у якіх у студэнцкія гады атрымаўся задзел у навуковай рабоце. Яны знаходзяцца на штатных пасадах па гаспадарчаму дагавору. У дагаворах прымае ўдзел каля 240 студэнтаў факультэта. На кафедрах радыёфізікі і электронікі ЗВЧ, кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі і на кафедры ЭММ створаны студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі і вылічальны цэнтр. Студэнты самі заключаюць дагаворы і вядуць іх. Як правіла, яны добра вучацца, рыхтуюць даклады, выступаюць на канферэнцыях.

**Л. А. Севасцьянчык, дырэктар выдавецтва**

Намаганні калектыву выдавецтва накіраваны на тое, каб дабіцца як мага больш высокай эфектыўнасці выпускаемых выданняў. Але ўсё гэта залежыць не толькі ад нас. Наш план з'яўляецца адлюстраваннем навукова-даследчай дзейнасці БДУ і іншых вну рэспублікі.

Мы сабралі заяўкі для ўключэння ў перспектыўны план 1975—1980 гадоў. І трэба адзначыць, што ў іх вельмі мала актуальных праблемных работ, многія з іх дробнатэмныя. Зусім мала даследаванняў па распрацоўцы праблем развітага сацыялістычнага грамадства, светапоглядных асноў камуністычнага выхавання, праблем і дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і многіх актуальных пытанняў з розных галін навукі. Непрапарцыянальна многа прапаноўваецца тэм па даследаванню мінулых перыядаў.

І нашы аўтары, і мы яшчэ мала задумваемся над тым, колькі новай інфармацыі нясуць нашы выданні.

Тэматычны план, як ні дзіўна, амаль не адлюстроўвае плана навуковых даследаванняў універсітэта. І так атрымліваецца, што публікацыі па актуальных і фундаментальных даследаваннях аказваюцца часцей за ўсё не планавымі.

Кафедральныя зборнікі артыкулаў, якія прапануюцца нам як планавыя выданні, нярэдка бываюць дробнатэмнымі і не знаходзяць пакупнікоў і чытачоў.

Ёсць у нас прэтэнзіі да рэдкалегій журнала «Веснік БДУ», якія адказваюць за камплектаванне нумароў. Мала ўвагі ўдзяляюць яны актуальнасці і змястоўнасці журнала.



**У. В. Лютаў, загадчык ваеннай кафедры**

У нашым універсітэце накоплен станоўчы вопыт ваенна-патрыятычнага выхавання, склаліся яго напрамкі і формы. Павысілася цікавасць студэнтаў да распрацоўкі ваенна-патрыятычных пытанняў. На XXX студэнцкай навуковай канферэнцыі універсітэта на гістарычным факультэце (секцыя гісторыі КПСС) 11 дакладаў з 42 былі на ваенна-патрыятычную тэму, а на секцыі гісторыі СССР — 4 з 22. З дыпломных работ студэнтаў гістарычнага факультэта, якія спецыялізаваліся па гісторыі КПСС, 15—па ваенна-патрыятычнай тэматыцы.

Больш увагі стала ўдзяляцца масавым мерапрыемствам. Толькі ў мінулым навучальным годзе ва універсітэце праведзена 45 тэматычных вечароў, 297 сустрэч з Героямі Савецкага Саюза, удзельнікамі войнаў, выдатнікамі баявой і палітычнай падрыхтоўкі, у якіх удзельнічала больш 34 тысяч студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта.

Разам з тым, у справе ваенна-патрыятычнага выхавання асобныя камсамольскія арганізацыі не праяўлялі належнай ініцыятывы і настойлівасці ў арганізацыі спаборніцтва па ваенна-прыкладных відах спорту. У гэтых недахопах, відаць, ёсць недапрацоўкі і партыйнай арганізацыі ваеннай кафедры.

Сур'ёзныя недахопы ёсць у арганізацыі здачы норм ГПА.

**І. У. Арэхоўская, дырэктар бібліятэкі**

У цяперашні час тэхнічнае аснашчэнне бібліятэкі вельмі беднае. У нас адсутнічае множыцельная тэхніка. Мы не маем магчымасці аднавіць вырваныя чытачамі старонкі, не можам на высокім узроўні арганізаваць інфармацыйную работу. Наяўнасць тэхнічных сродкаў дазволіла б бібліятэцы весці фатаграфічную інфармацыю, прадстаўляць чытачам асобныя адбіткі артыкулаў з новых часопісаў, галоўным чынам замежных, па зацікавіўшых тэмах, мець фанатэку запісаў лепшых лекцый прафесараў, стварыць якую нам прапануюць студэнты.

# З УСЁЙ АДКАЗНАСЦЮ

ліне тэорыі дыферэнцыяльных і інтэгральных ураўненняў, тэорыі функцый комплекснага пераменнага, лінейнай алгебры, геаметрыі; хімікамі—па распрацоўцы новых варыянтаў фатаграфічнага працэсу, сінтэзу арганічных злучэнняў, тэорыі іённага абмену і малекулярнай сорбцыі, мадэрнізацыі палімераў. Сур'ёзныя даследаванні былі праведзены вучонымі біялагічнага, філалагічнага, юрыдычнага, геаграфічнага факультэтаў, кафедрамі грамадскіх навук.

У 1971—1973 гг. па гаспадарчых дагаворах вяліся даследаванні па 191 тэме на суму 4310,2 тыс. рублёў. Па

## СВАЕ НАМАГАННІ

### З ДАКЛАДА САКРАТАРА ПАРТКОМА Т. Я. ДУДАРАВАЙ

выкананых 104 тэмах атрыман эканамічны эфект у суме 1 мільён 332,5 тысячы рублёў.

Па папярэдніх даных у 1973 годзе будзе выканана гаспадарча-дагаворных работ на суму 2,6—2,8 млн. рублёў.

Навукова - педагагічным калектывам універсітэта у 1971—1972 гг. апублікаваны 2924 навуковыя артыкулы, 175 манаграфій і падручнікаў (аб'ёмам 2054 друкаваныя лісты), атрымана 18 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы. У тым ліку супрацоўнікамі філалагічнага факультэта—42 манаграфіі і падручнікі, юрыдычнага — 20, журналістыкі—6, кафедрамі грамадскіх навук—34. Менш выдаецца манаграфічных даследаванняў па прыродазнаўчых навуках.

У справаздачным перыядзе больш актыўна прыцягваліся да ўдзелу ў НДР студэнты. У гэтым вялікая заслуга кіраўніка СНТ універсітэта кандыдата ў члены КПСС Д. М. Саковіча. У цяперашні час у розных формах навуковага даследавання ўдзельнічае амаль $^{2}/_{3}$ студэнтаў стацыянара. Створаны і паспяхова працуюць дзве СНДЛ фізфака, СКБ факультэта прыкладной матэматыкі, групы СКБ пры некаторых кафедрах.

Штогод павялічваецца колькасць студэнцкіх навуковых работ. Калі ў 1971—1972 навучальным годзе на рэспубліканскі агляд было прадстаўлена 353 работы, то ў 1972—1973—391 работа, а сёлета звыш 400.

Разам з тым у пастаноўцы навуковых даследаванняў ёсць істотныя недахопы. На гуманітарных факультэтах усё яшчэ вялікі аб'ём індывідуальных дробных тэм. Так, на факультэце журналістыкі ў мінулым годзе 25 выкладчыкаў распрацоўвалі 23 тэмы і на 1974 год на 26 выкладчыкаў запланавана 25 тэм. На гістарычным факультэце 63 выкладчыкі распрацоўвалі 56 тэм, на юрыдычным 60 выкладчыкаў — 49 тэм, што, відома, зніжала глыбіню навуковых даследаванняў, атрыманне эфектыўных вынікаў у больш кароткі тэрмін. Нізкая эфектыўнасць даследчай работы на кафедрах замежных моў, фізічнага выхавання і спорту.

Сур'ёзным недахопам з'яўляецца тое, што фундаментальныя даследаванні выконваюцца на працягу доўгага часу і не адкрываюць у шэрагу выпадкаў перспектывы вытворчага ўкаранення. На асобных кафедрах і ў лабараторыях да гэтай пары не вызначаны асноўныя навуковыя напрамкі, не наладжан дакладны кантроль за навуковай работай кожнага выкладчыка, не заўсёды даецца тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне распачатых даследаванняў. Гаспадарча-дагаворная тэматыка носіць пераважна пошукавы характар і заканчваецца дачай агульных рэкамендацый. Нізкая эфектыўнасць гаспадарча-дагаворных даследаванняў у параўнанні з затратамі.

Сур'ёзная работа праводзілася па падрыхтоўцы навуковых кадраў. У 1972 годзе ў аспірантуры навучаліся 361 чалавек, а ў 1972 — 385, да кіраўніцтва аспірантамі прыцягнута 90 дактароў і 92 кандыдаты навук. Палепшыўся аспіранцкі састаў. Паспяхова вядуць падрыхтоўку аспірантаў прафесары У. В. Ізох, Ю. С. Багданаў, М. Г. Булахаў, А. Ф. Чарняўскі, У. М. Сікорскі, І. А. Прусаў, М. Я. Шкляр, І. Р. Круцько і іншыя. Аднак на некаторых кафедрах слаба пастаўлена падрыхтоўка аспірантаў.

Сур'ёзную ўвагу на падрыхтоўку навуковых кадраў павінны звярнуць кіраўніцтва і партарганізацыі інстытута прыкладных фізічных праблем, дзе кантынгент навуковых супрацоўнікаў з вучонымі ступенямі складае менш 10 працэнтаў. А магчымасці ж там вялікія. У інстытуце працуе многа здольнай моладзі.

### ІДЭАЛАГІЧНАЯ РАБОТА

Партком, партыйныя арганізацыі першаступенную ўвагу ўдзялялі пытанням ідэйна-выхаваўчай работы. Толькі за мінулы навучальны год на парткоме былі заслуханы пытанні: аб стане палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнтаў юрыдычнага факультэта; ваенна-патрыятычнае выхаванне студэнтаў; работа сеткі партыйнай вучобы; аб падпісцы на перыядычны друк, аб рабоце куратараў на фізічным факультэце і інш. У красавіку гэтага года пытанне аб паляпшэнні ідэйнага выхавання студэнтаў абмеркавана на агульным партыйным сходзе БДУ. Аб эфектыўнасці ідэалагічнай работы ішла размова на партыйных сходах у верасні—кастрычніку гэтага года. Як на агульным, так і на сходах у пярвічных арганізацыях былі выяўлены і крытычна разгледжаны недахопы ў арганізацыі ідэйнага выхавання студэнтаў. Партком сумесна з партбюро прынялі шэраг дадатковых мер па паляпшэнню гэтай работы. У мінулым навучальным годзе пры дапамозе вялікай групы партыйнага актыву быў прааналізаван удзел выкладчыкаў кафедр (за выключэннем грамадскіх) у ідэйна-выхаваўчай рабоце, вывучана пытанне аб ідэйнай накіраванасці выкладання, аб здзяйсненні кантролю з боку кафедр за ідэйным узроўнем заняткаў. Задача цяпер заключаецца ў тым, каб паўней ажыццявіць намечаныя захады.

Асаблівая роля ў ідэйным выхаванні ў ходзе вучэбнага працэсу належыць грамадскім навукам. І партком разам з кафедрамі грамадскіх навук імкнуўся палепшыць якасць выкладання грамадскіх навук. Кафедры былі ўмацаваны кваліфікаванымі выкладчыкамі. У бягучым навучальным годзе тут працуюць 17 прафесараў, 88 кандыдатаў навук і дацэнтаў.

Значна палепшылася метадычная работа. Вызначана спецыялізацыя студэнтаў старэйшых курсаў па гісторыі КПСС, марксісцка-ленінскай філасофіі і палітэканоміі. Па гэтых прадметах уключаны ў вучэбны план новыя спецкурсы і спецсемінары, абноўлена тэматыка курсавых і дыпломных работ. Аб выніках красамоўна сведчыць паспяховасць. Яна складае 98,4 працэнта.

Аднак кафедры ўсё яшчэ недастаткова ўдзяляюць увагі пытанням перабудовы і ўдасканалення вучэбнага працэсу, мала абмяркоўваецца методыка чытання лекцый і правядзення семінарскіх заняткаў, тэкстаў лекцый. На некаторых кафедрах не наладжаны рэгулярныя ўзаеманаведванні заняткаў. Недастатковы кантроль за работай выкладчыкаў.

Слаба прымяняюцца ў выкладанні тэхнічныя сродкі, асобныя выкладчыкі не валодаюць методыкай прымянення наглядных дапаможнікаў.

Кафедрай марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў да гэтай пары не чытаюцца спецкурсы па важнейшых праблемах філасофіі прыродазнаўства на матэматычным, біялагічным, хімічным і геаграфічным факультэтах.

На кафедрах палітэканоміі прыродазнаўчых і гуманітарных факультэтаў не завершана работа па вызначэнню тэматыкі спецкурсаў па важнейшых эканамічных праблемах сацыялізму. Камуністаў кафедр палітэканоміі павінен насцеражыць той факт, што паспяховасць па палітэканоміі ў мінулым навучальным годзе знізілася ў параўнанні з папярэднімі гадамі. На парткоме заслухоўваліся справаздачы аб рабоце кафедр палітэканоміі, марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковага камунізму.

Ва універсітэце складзен пяцігадовы план палітыка-выхаваўчай работы, агульны і на кожным факультэце. Аднак на мінулым партыйным сходзе быў зроблен папрок у адрас парткома за тое, што ён не змог устанавіць паўсядзённага кантролю над здзяйсненнем планаў ідэйна - выхаваўчай работы, дабіцца выкаранення фармалізму ў гэтай справе. Партком улічыў гэтыя заўвагі. Планы ідэйна-выхаваўчай работы былі яшчэ раз прааналізаваны, канкрэтызаваны на многіх кафедрах, факультэтах. Устаноўлен больш строгі кантроль за іх здзяйсненнем. г. д. Але, крытычна ацэньваючы вынікі, мы павінны галоўную ўвагу сканцэнтраваць на недахопах. Галоўным з іх з'яўляецца тое, што мы не змаглі дабіцца неабходнай эфектыўнасці праводзімай работы. Чым, як не гэтым, можна вытлумачыць той факт, што ў нас яшчэ не выкаранены факты амаральных учынкаў з боку студэнтаў. Мы яшчэ не навучыліся даходзіць да кожнага чалавека і больш працуем сярод актыву, найбольш свядомай часткі студэнтаў. Трэба ўзняць адказнасць партыйных груп і камсамольскіх арганізацый за пастаноўку ідэйна-выхаваўчай работы ў групе, узняць ролю куратара.

Выконваючы рашэнні мінулага партыйнага сходу, партком, партбюро прынялі меры, каб палепшыць якасны састаў куратараў. У выніку сярод іх узрасла партыйная праслойка, павялічылася колькасць кандыдатаў навук і дацэнтаў. Цяпер кожны чацвёрты куратар — камуніст, кожны трэці—кандыдат навук, дацэнт.

Сур'ёзныя недахопы ёсць у арганізацыі выхаваўчай работы ў інтэрнатах, дзе пражывае больш пяці тысяч чалавек. На гэтыя недахопы нам указала бюро Мінскага гаркома партыі пры абмеркаванні справаздачы «Аб стане выхаваўчай работы ў інтэрнатах». Выконваючы пастанову бюро гаркома, партком, партарганізацыі і дэканаты прынялі меры па узмацненню гэтай работы. Праведзены перавыбары студсаветаў, яны ўмацаваны за лік камуністаў, у кожным інтэрнаце створаны партгрупы, складзены і зацверджаны планы выхаваўчай работы. Гэтыя планы разгледжаны ў парткоме.

Адной з важнейшых форм палітычнага выхавання з'яўляецца правядзенне палітінфармацый. Партком, партбюро дабіліся такога палажэння, калі ў большасці груп палітінфармацыі праходзяць рэгулярна, яны сталі больш мэтанакіраванымі. Палепшылася інструктаванне палітінфарматараў. Аднак якасць некаторых палітінфармацый яшчэ нізкая, да гэтай пары сустракаюцца факты зрываў, пераносу палітінфармацый, былі факты, калі ў графіку палітінфармацый на біяфаку, філфаку, напрыклад, не ўказваліся час і месца іх правядзення, калі ў некаторых групах факультэта журналістыкі, фізічнага, матэматычнага, юрыдычнага, геаграфічнага факультэтаў адсутнічала прыкладная тэматыка, у той час як яна была зацверджана на парткоме і разаслана па факультэтах.

Арганізоўваючы ідэйна-выхаваўчую работу, партком, партбюро імкнуліся ўзняць ролю ўсіх звенняў ідэалагічнага ўздзеяння: перыядычнага друку, насценных газет, нагляднай агітацыі, мастацкай самадзейнасці і г. д.

Нямала добрых матэрыялаў публікуецца ў газеце «Беларускі універсітэт», аднак гэтыя матэрыялы слаба яшчэ выкарыстоўваюцца ў выхаваўчай рабоце. Як і раней, газета робіцца вузкім колам аўтарскага актыву. Слаба працуюць карэспандэнцкія пункты на матэматычным, геаграфічным, юрыдычным, гістарычным факультэтах. У газету мала пішуць члены парткома, партбюро, прафесары, выкладчыкі. Партком на апошніх двух пасяджэннях зацвердзіў новы састаў карэспандэнцкіх пунктаў па факультэтах і патрабаваў ад іх актыўнай работы. Мы спадзяемся, што гэта дасць станоўчыя вынікі.

Гаворачы аб ідэалагічнай рабоце, належыць адзначыць вялікую агітацыйна-прапагандысцкую дзейнасць універсітэцкага калектыву.

---

Камуністы, якія прынялі ўдзел у абмеркаванні даклада, далі ацэнку рабоце парткома, падвялі вынікі дзейнасці камуністаў універсітэта на ўсіх участках працы, ускрылі недахопы і выказалі свае меркаванні і прапановы па іх выкараненню.

Дырэктар інстытута прыкладных фізічных праблем **А. Н. Сеўчанка** сканцэнтраваў увагу на падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі, расказаў пра вялікую гаспадарча-дагаворную працу калектыву інстытута і яго патрэбы.

Загадчык кафедры палітэканоміі **У. К. Драчоў** падзяліўся вопытам супрацоўніцтва з інстытутам народнай гаспадаркі.

— Курс, які выбраў наш партыйны камітэт, цалкам правільны. Ён у поўнай меры адпавядае рашэнням XXIV з'езда КПСС,— характарызуючы справаздачны даклад, гаворыць дэкан хімфака **Г. А. Браніцкі.**

Г. А. Браніцкі звязвае поспехі факультэта з дзейнасцю партыйнай арганізацыі. На факультэце працуе 91 кандыдат навук, толькі сёлета абаронена тры доктарскія дысертацыі. У вучэбны працэс уводзяцца элементы машыннага і безмашыннага (тэставага) кантролю паспяховасці. Заахвочваецца ўдзел студэнтаў у гаспадарча-дагаворных работах. Характар спецпрактыкумаў і спецкурсаў перагледжан такім чынам, каб заставіць студэнтаў актыўна ўключацца ў навукова-даследчую работу. Дзякуючы прынятым мерам паспяховасць тут у вясеннюю сесію склала 95,6 працэнта.

Партгрупорг, студэнт гістарычнага факультэта **В. А. Андруховіч,** падзяліўся вопытам работы партгруп на факультэце.

Адзначыўшы вялікую ўвагу парткома да патрэб факультэтаў і канкрэтную дапамогу, дэкан біяфака **А. Ц. Пікулеў** высветліў тыя напрамкі, дзе трэба сканцэнтраваць намаганні, падкрэсліў ролю партыйных груп у паспяховым вырашэнні паўсядзённых задач.

А. Ц. Пікулеў выказаў меркаванне аб дыферэнцыраванай падрыхтоўцы спецыялістаў-біёлагаў для школ і для вытворчасці.

— Калі мы збіраемся на справаздачна-выбарны сход, то не толькі падводзім вынікі, але і думаем пра перспектывы. Аб іх жа ў дакладзе было мала сказана,— гаворыць дэкан філфака **А. А. Волк.**

Ён завастрае ўвагу на развіцці філалагічнай адукацыі, магчымасцях падрыхтоўкі спецыялістаў па славянскай філалогіі, прыкладной лінгвістыцы і іншых спецыялізацыях і заклікае вырашыць гэтыя пытанні ў бліжэйшы час.

Рэктар БДУ **У. М. Сікорскі** адзначыў, што ў дакладзе сакратара парткома Т. Я. Дударавай даволі поўна ахарактарызавана дзейнасць партыйнай арганізацыі. Ёсць значныя поспехі і дасягненні ў галіне навуковых даследаванняў. Павялічылася колькасць гаспадарча-дагаворных работ. Цяпер іх вядзе не толькі фізфак, які быў піянерам у гэтай справе, але і хімфак, геафак, кафедры грамадскіх навук. Павысілася дысцыпліна і грамадская актыўнасць студэнтаў. Мацнеюць замежныя сувязі. Ва ўсім гэтым заслуга перш за ўсё парткома, камуністаў універсітэта.

У. М. Сікорскі гаворыць пра неабходнасць мэтанакіравана вырашаць ужо намечаныя задачы: ажыццяўляць навуковую арганізацыю навучальнага працэсу, кантроль за паспяховасцю, павысіць адказнасць кожнага выкладчыка за падрыхтоўку сапраўды высакаякаснага спецыяліста, дабіцца большай эфектыўнасці навуковых даследаванняў, зрабіць больш дзейснай сістэму грамадска - палітычнай практыкі, павысіць патрабавальнасць пры атэстацыі студэнтаў.

Па просьбе камуністаў тав. Сікорскі многа ўвагі ўдзяліў перспектывам развіцця універсітэта.

На сходзе выступіў сакратар абкома партыі **У. С. Багданаў,** які сканцэнтраваў увагу камуністаў на важнейшых задачах флагмана вну рэспублікі, прааналізаваў вынікі выхаваўчай работы, зрабіў заўвагі па праграмах навучання, арганізацыі навучальнага працэсу.

Выбран новы састаў партыйнага камітэта ў складзе 17 чалавек. Сакратаром парткома выбрана **Т. Я. Дударава,** намеснікам сакратара — **В. І. Пракошын.**

Выбраны дэлегаты на XXVII раённую партыйную канферэнцыю і састаў камісіі па кантролю за станам навуковай і вучэбна-выхаваўчай работы.



# КАЛІ НАС ПАДРУЖЫЎ СБА...

**Два гады працуе на меліярацыі ў Барысаўскай зоне СБА «Верасок» філалагічнага факультэта. Узначальвае яго студэнтка IV курса Ася Надольская.**

**Сёлета атрад заняў I месца ў Мінскай вобласці. I гэта адзіны атрад рэспублікі, які прадстаўлен да ўзнагароды Міністэрствам меліярацыі і воднай гаспадаркі СССР.**

Два месяцы над вёскай Забор'е Чэрвеньскага раёна развяваліся сцяг Беларускай ССР і вымпел атрада «Верасок-73» БДУ. 29 студэнтаў-філолагаў, байцоў атрада, розных па-характару, па ўзросту, але апанаваных рамантыкай, незвычайнасцю і харaством студэнцкага лета, упарта штурмавалі балоты, пераўтваралі топістыя землі ва ўраджайныя, пладародныя нівы.

Цяжка, але цікава працаваць на меліярацыі. Работа, дарэчы, мужчынская. Хаця... Трэба было бачыць, з якім задорам працавалі нашы дзяўчаты! А мэтанакіраванасць і настойлівасць, выдатныя арганізатарскія здольнасці Асі Надольскай, камандзіра гэтага ледзь не поўнасцю мужчынскага атрада! Кожную мінуту ў руху, пошуку, у чулых, уважлівых адносінах да байцоў — такой мы ведаем Асю. I поспех атрада ў вытворчай дзейнасці (16 км канала, 96 тысяч асвоеных капіталаўкладанняў), у грамадска-палітычнай рабоце (10 выступленняў агітбрыгады, 18 прачытаных лекцый, 4 выпушчаныя насценгазеты і г. д.) — гэта і яе поспех.

Цяпер, калі мы знаходзімся ўжо на значнай адлегласці ад таго цудоўнага і шчаслівага часу, дакладней і ярчэй выдзяляецца сапраўдная работа васьмі хлопцаў-калабоеў з іх нястомным брыгадзірам Валерай Курчавым. Гэтыя хлопцы з «Вераска» пабілі ўсе рэкорды па забіўцы калкоў — 900 метраў у дзень.

Быў вечар. Заслона туману ўсё гушчэй і гушчэй аплятала кусты і дрэвы. Яны, гэтыя восем моцных, валявых, загартаваных сонцам, дажджамі і ветрам, калабоеў, як казачныя героі, падняліся па насыпу з канала. I прымнула тады песня калабоеў, напісаная паэтам і калабоем Георгіем Кукліквам:

— Лишь когда садится
солнце,
Затихает мерный бой.
Дарит белые ромашки
Дерновщицам колобой.

Не толькі калабоі, але і брыгады нарэзчыкаў і грузчыкаў дзёрну (брыгадзір Ваня Штэйнер, удзельнік трох працоўных семестраў), брыгада прысыпкі (брыгадзір Коля Грамянок), брыгада ўкладчыкаў дзёрну (брыгадзір Яша Ярашэвіч) —усе працавалі па-ўдарнаму, па-сапраўднаму.

Студэнцкі гарадок. Так назвалі мы сваё месца жыхарства. Вагончыкі —кубрыкі, у кожнага свая назва; лінейка з флагштокам, размешчаная ў цэнтры гарадка, штаб, ленкомната, медпункт. Тут мы жылі, рыхтаваліся да выступлення агітбрыгады, праводзілі шашачны турнір, гулялі ў валейбол. Збіраліся вечарам ля вагончыкаў, успаміналі, смяяліся, спявалі. I калі мы пакідалі гэтыя, стаўшыя роднымі нам месцы, развітваліся са сваім студэнцкім гарадком, было сумна.

Атрад «Верасок-73» і цяпер прадаўжае жыць тым цікавым і вясёлым жыццём, навыкі якога былі набыты летам. Часта' ў інтэрнаце збіраюцца хлопцы і дзяўчаты, «вераскоўцы», — так называюць нас на філфаку. Успамінаем «былыя паходы», спяваем. Гляджу на іх, вясёлых, блізкіх, моцна пасябраваўшых, і пачынаю разумець вялікае значэнне студэнцкіх будаўнічых атрадаў. СБА зближае студэнтаў, умацоўвае іх дружбу. Цяжка цяпер уявіць атрад без гумарыста Сані Мячая, без атраднага ўрача Колі Тарасевіча, нястомнага апавядальніка вясёлых гісторый Славы Жыбуля, без баяна і песень Юры Міхеда, без удумлівага і разважлівага камсорга Мішы Ціцянкова, без задорнага смеху дзяўчат-паварых і дзернаўшчыц Ларысы Раманюк і Любы Хромчанкі, Томы Шайтар і Алы Стралкоўскай.

Пройдзе зусім нямнога часу, і ў дарогу на недалёкую планету студэнцкага лета пачне збірацца «Верасок-74».

**У. ЛАЙКОЎ,**
**камісар СБА «Верасок» філфака.**



— Зямлю я стварыў?
— Стварыў.
— Студэнтаў я стварыў?
— Стварыў.
— Што ж я яшчэ не стварыў?

Так пачынаецца урачыстая цырымонія: першакурснікі пасвячаюцца ў студэнты. Гістарычная «Галактына» узаконьвае знаходжанне ў сваіх глыбінях новых жыхароў — цяпер ужо сапраўдных жыхароў планеты «Першы курс».

У гэты вечар павіншаваць «самых маленькіх» гісторыкаў прыйшлі амаль усе гістфакаўцы. Сяброўская цеплыня перапаўняла кожнага першакурсніка ад такіх сардэчных віншаванняў і добрых пажаданняў.

**Т. ЛЕАНКОВА.**
Фота аўтара.

## «ПЕСНЯ, УСМЕШКА І Я»

Знаёмства з добрым чалавекам — гэта цудоўна! А калі знаёмяцца адразу амаль пяцьдзесят добрых людзей— гэта ж у пяцьдзесят разоў цудоўней, ці не праўда?

Гэты вечар пад назвай «Песня, усмешка і я» быў вечарам знаёмства дзяўчат пятай групы другога курса хімічнага факультэта і хлопцаў з першага курса факультэта аўтамеханікі і вылічальнай тэхнікі радыётэхнічнага інстытута.

Назву вечара прыдумалі дзяўчаты. Таня Булаўка, вядучая, тлумачыць, чаму яны спыніліся іменна на ёй: «Усе вы ведаеце, што адна хвіліна смеху прадаўжае жыццё на паўгадзіны. Хіба вы не хочаце доўга жыць? Песня—вечны спадарожнік смеху. А сёння і мы будзем разам з ей. І я думаю, што не толькі сёння».

Вечар прадоўжылі Света Рогава і Лена Шляхціна. Яны з задавальненнем паказалі сцэнкі з жыцця будаўнічага атрада, у якім былі летам. Дарэчы, у атрадзе «Ку. лінка» працавалі адны дзяўчаты. І працавалі нядрэнна.

Потым Таня аб'явіла конкурс каралевы балю і яе рыцара. Усе хлопцы аддалі пальму першынства ёй, самай прыгожай у гэты вечар. Затое паміж кандыдатамі на ролю рыцара разгарэлася ўпартая барацьба, у якой перамог Грыша Бальдзюсаў.

**Л. НІКУЛІНА.**

# ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ

Раней работа спортбюро філфака выклікала многа справядлівых нараканняў. Студэнты не праяўлялі вялікай актыўнасці пры правядзенні спартыўных мерапрыемстваў. Напрыклад, у факультэцкіх першынствах па баскетболу і валейболу ўдзельнічалі ўсяго толькі два курсы. У выніку — слабыя выступленні на агульнаўніверсітэцкіх спаборніцтвах.

У ходзе апошняй агульнаўніверсітэцкай спартакіяды філолагі паказалі нізкія вынікі: баскетбалісты занялі VIII месца, пакінуўшы пасля сябе толькі каманду журфака, баскетбалісткі — VI. Мужчынская і жаночая валейбольныя каманды — адпаведна IX і VI месцы. Футбалісты і гімнасты былі апошнімі. Калі каманда па спартыўнай гімнастыцы можа апраўдацца малалікім саставам, то футбалісты ўпусцілі свае магчымасці галоўным чынам з-за абыякавасці да спартыўнага гонару факультэта многіх ігракоў, якія проста не з'яўляліся на матчы. Каманда нярэдка выступала ў няпоўным саставе. Толькі па двух відах — веласпорту і арыентаванні на мясцовасці — філолагі занялі другія прызавыя месцы.

Не бліскуча студэнты філфака выступалі і ў традыцыйным кросе. Праўда, восенню мінулага года яны занялі V месца. Да вясенняга падрыхтаваліся горш. У выніку — больш чым сціплае VIII месца.

У гэтым годзе становішча пачынае змяняцца ў лепшы бок. Спартыўнае бюро абнавілася, у асноўным, за лік першакурснікаў. Новае бюро энергічна ўзялося за работу. Актыўна дзейнічаюць старшыня бюро І. Кучынскі (III бел.), А. Калюта (IV рус.), Г. Свірыда (IV рус.), В. Аноп (II бел.), Н. Згіроўская (I рус.), Н. Трэскіна (II рус.) і іншыя. І вось першыя вынікі. Лепш выступаюць баскетбольныя каманды, асабліва дзяўчаты. Яны запар выйгралі два апошнія матчы: у біёлагаў (48:9) і гісторыкаў (40:30). Хлопцы атрымалі пераканаўчую перамогу над камандай журфака (43:30).

Больш увагі ўдзяляе бюро папулярызацыі спорту. Выпускаюцца інфармацыйныя лісткі, у якіх адлюстроўваюцца вынікі спаборніцтваў. На пасяджэнні бюро ў кастрычніку быў прынят план спартыўна-масавых мерапрыемстваў. Сярод іх — актыўны ўдзел у агульнаўніверсітэцкім спартыўным вечары, правядзенне таварыскага матча па настольнаму тэнісу з замежнымі студэнтамі, якія навучаюцца на філфаку, баскетбольная сустрэча са студэнтамі Вільнюскага ўніверсітэта і інш.

Усё гэта, канешне, добра. Аднак у спартыўнай рабоце шмат яшчэ недахопаў, упушчэнняў. Дрэнна працуе камісія па ўкараненню новага комплексу ГПА. Здалі нормы пакуль толькі 35 працэнтаў студэнтаў. Асабліва неахвотна здаюць нарматыў пяцікурснікі, якія ўвогуле рэдкія госці на факультэце. У рабоце па комплексу ГПА філфак займае IX месца.

Узнікаюць цяжкасці і пры правядзенні чэмпіянатаў па шашках і шахматах: доўга даводзіцца шукаць свабодную аўдыторыю. Не хапае камплектаў шашак і шахмат.

Спартыўнаму бюро патрэбна сур'ёзная дапамога дэканата і грамадскіх арганізацый. Вельмі ж гэта важна — выхоўваць добрых, таленавітых спартсменаў і проста здаровых, моцных, вынослівых людзей.

**А. ЦІКОЦКІ,**
**студэнт III курса філфака.**

## На спартыўнай арбіце



## Свет вачыма дзяцей

**У гэтыя дні на хімічным факультэце праводзіцца конкурс-выстаўка дзіцячага малюнка «До чего же хорошо кругом!», у якім прымаюць удзел 20 хлапчукоў і дзяўчынак ва ўзросце ад 4-х да 14 год.**

Тэматыка малюнкаў юных мастакоў вельмі разнастайная.

Вялікую ўвагу прыцягваюць работы Сярожы Акуловіча, Лены Кухаронак, Марыны Махнач, Вольгі Гуслевай, Мішы Майракава.

На здымках прадстаўлены малюнкі Вольгі Гуслевай (14 год) «Наш горад», Лены Кухаронак «Лета ў вёсцы».

8 снежня на факультэце адбудзецца ранішнік для юных мастакоў, на якім дзецям раскажуць аб хіміі, пакажуць лабараторыі, пасля чаго будуць узнагароджаны пераможцы конкурсу.

**Н. СЕВЯРЫНАВА.**
**адказная за культмасавую работу прафбюро хімічнага факультэта.**





## СТАРТУЮЦЬ ВАЛЕЙБАЛІСТЫ

Адным з найбольш масавых і даступных відаў спорту з'яўляецца валейбол. Ва ўніверсітэце ў групах спецыялізацыі на занятках па фізвыхаванню і ў секцыях ім займаецца каля 300 чалавек.

З трэцяга снежня спорт-клуб і бюро секцыі валейбола пачынаюць праводзіць першынства універсітэта. Штогод у гэтых спаборніцтвах прымаюць удзел зборныя каманды ўсіх факультэтаў.

Сярод жаночых каманд апошнія тры гады не ведаюць паражэнняў валейбалісткі ФПМ. У складзе каманды гэтага факультэта выступалі члены зборнай рэспублікі і горада Мінска майстар спорту Людміла Антонава, кандыдаты ў майстры Валянціна Трахіменка, Ларыса Дубовік, Вольга Сачкіна. Цяпер каманду ўзначальваюць Марыя Кунцэвіч і НадзеяВаўчок.

Сярод мужчынскіх каманд першынства трымаюць пакуль гісторыкі і фізікі. Гонар зборнай каманды фізічнага факультэта неаднаразова абаранялі майстар спорту Юрый Васільеў, Андрэй Кірылаў, Аляксандр Ільюшчанка, член маладзёжнай зборнай СССР Раман Кароль.

Стартуе чарговы чэмпіянат універсітэта па валейболу. Спадзяёмся, што любіцелі гэтай гульні, актыўныя балельшчыкі, падтрымаюць свае каманды ў барацьбе за ганаровы тытул.

**М. КУЧЫНСКІ,**
**выкладчык кафедры фізвыхавання.**

## НОВЫЯ КНІГІ ПА ЎСЕАГУЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ,

### ЯКІЯ ПАСТУПІЛІ Ў БІБЛІЯТЭКУ БДУ Ў ЛІСТАПАДЗЕ

1. Античная древность и средние века. Сб. статей. Сб. 9. Свердловск, 1973.
2. Ибрагимов, Б. Белуджи Пакистана. (Соц.-экон. положение в Пакист. Белуджистане и нац. движение белуджей в 1947—1970 гг.). М., «Наука», 1973.
3. Из истории нового и новейшего времени. Сборник трудов. М., 1973.
4. Макаренкова, Е. М. Французская социалистическая партия в годы IV республики. М., «Наука», 1973.
5. Некоторые вопросы всеобщей истории. Тула, «Коммунар», 1973.
6. Очерки экономической и социальной истории Индии. Сборник. М., «Наука», 1973.
7. Павлов, В. И. Социально-экономическая структура промышленности Индии. Ист. предпосылки генезиса капитализма. (Конец XVIII — средина XIX в.). М., «Наука», 1973.
8. Парижская коммуна и марксизм. (Очерки). М., «Политиздат», 1973.
9. Субботин, В. А. Колонии Франции в 1870—1918 гг. Троп. Африка и острова Инд. океана. М., «Наука», 1973.
10. Хмелева, Н. Г. Государство Абд аль-Кадира алжирского. М., «Наука», 1973.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета имени В. И. Ленина.
Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Газета выходзіць па чацвяргах.
Тыраж 2000 экз.

Аб'ём — 1 друк ар.
Зак. 1435. АТ 20083